КНІГА МЕТРЫКІ ВКЛ № 560 ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЛІТВІНСКА-ЛІВОНСКІХ АДНОСІН У КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

Л.В. Мікалаева, к.г.н., дацэнт
УА “БДУІР”, г. Мінск

Значны перыяд у гісторыі беларускай дзяржаўнасці звязаны з часам уваходжання нашых зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Так як адным з атрыбутаў дзяржавы з’яўляецца тэрыторыя, то справа дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўных межаў пратвараецца ў адно з найбольш актуальных і надзённых пытанняў. Для рэканструкцыі механізму правядзення азначанай працэдуры ў ранненавачасны перыяд паспяхова можа быць выкарыстана Кніга № 560 Метрыкі ВКЛ.

Месцам захоўвання Кнігі № 560 з’яўляецца Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў у Маскве [3]. Для падрыхтоўкі дадзенага матэрыяла намі была выкарыстана фільмакопія Кнігі № 560, што захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску [2], а таксама другое яе выданне, падрыхтаванае і ажыццёўленае ў 2010 г. А.І. Дзярновічам [1]. З-за большай даступнасці апошняй для чытача спасылкі ў тэксце будуць рабіцца на публікацыю.

Кніга № 560 цалкам прысвечана справам мяжы паміж ВКЛ і Лівонскай канфедэрацыяй. Яе матэрыялы дайшлі да нашага часу толькі ў складзе кнігі-копіі, зробленай, верагодна, у канцы XVI ст. па распараджэнні канцлера ВКЛ Льва Сапегі па прычыне абвятшаласці арыгінала [1, с. 9]. Змястоўна Кніга № 560 складаецца з акта дэмаркацыі літвінска-лівонскай мяжы, зробленай ў 1542 г. (з устаўкай фрагмента акта дэмаркацыі 1541 г., якая не была скончана [1, с. 59 – 60]) [1, с. 51 – 84] і запісаў скаргаў жыхароў ВКЛ на дзеянні памежнай адміністрацыі і жыхароў Лівоніі [1, с. 85 – 121].

Вызначальным у гэтай сувязі падаецца пачатковая частка акта дэмаркацыі. У ёй паведамляецца, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Казіміравіч накіраваў сваіх гападарскіх пасланцаў Івана Глебавіча Корсака і Яна Кміту Сакаловіча, каб яны “границы пописовали стародавъныи пана Радзивиловы дольгость и широкость, как дольго и широко Нѣмцы забрали зѣмъли г(о)с(по)д(а)ра Королѧ Его м(и)л(о)сти, зѣмълями пана Мистра Лиѳлѧнтъского почонъшы ѡтъ ѡзѣра Кѵрчомъ, аж до границъ Московъских” [1, с. 51]. Такім чынам, тут вызначана прычына ажыццяўлення азначанага мерапрыемства – парушэнне лівонскім бокам граніц, зафіксаваных яшчэ ў 1473 г. камісіяй, якую з літвінскага боку ўзначальваў пан Радзівіл Осцікавіч.

У Кнізе № 560 прыводзіцца дастаткова падрабязнае апісанне працэдуры дэмаркацыі. Ёй папярэднічаў абмен пасольствамі, праз якія вызначаўся дзень сустрэчы памежных камісараў. У 1542 г. сустрэча камісараў павінна была адбыцца 20 студзеня, але з-за спазнення лівонскіх прадстаўнікоў адбылася на

Библиотека БГУИР

дзень пазней [1, с. 60 – 61]. Традыцыйным месцам іх спаткання і пачатковай кропкай усіх дэмаркацый XV – XVI ст. было возера Курчмы (Курцум, зараз на тэрыторыі Даўгаўпілскага павета Латвійскай Рэспублікі) [1, с. 51, 60, 61].

Пасля сустрэчы камісараў адбывалася ўзгадненне спосабаў і метадаў ажыццяўлення дэмаркацыі. Прынцыповай пазіцыяй літвінскага боку было імкненне прытрымліватца усталяваных папярэдне межаў (у 1542 г. – Радзівілавых граніц 1473 г.), у адшуканні якіх у якасці праваднікоў павінны былі выступаць жыхары ВКЛ. Гэта запісвалася ў спецыяльных ідэнтычных па змесце актах, якія атрымлівалі абодва бакі [1, с. 61]. У далейшым з камісараў ВКЛ і Лівоніі стваралісе дзве групы, якія разыходзіліся на ўсход (да маскоўскай мяжы) і на захад (да Балтыйскага мора) ад возера Курчума. У склад кожнай з груп уваходзіла аднолькавая колькасць камісараў ад ВКЛ і Лівоніі [1, с. 62].

Пры ажыццяўленні далейшай працэдуры дэмаркацыі ігралі ролю і інструкцыі кіраўнікоў дзяржаў. Зразумела, што кожны з бакоў імкнуўся абараняць свае інтарэсы, таму дакладнасць і паўната такіх “навук” была гарантыяй паспяховасці ўсіх прызначаных мерапрыемстваў. У адваротным выпадку ўзнікалі цяжкасці ў працэсе дэмаркацыі, а часам нават прыпынялася сама працэдура, як гэта і адбылося ў 1542 г. па ініцыятыве лівонскіх камісараў, якім спатрэбілася дадатковая інструкцыя свайго ўладара [1, с. 62 – 63].

Падчас правядзення дэмаркацыі перыядычна ўзнікалі спрэчныя сітуацыі, звязаныя альбо са знікненнем старых знакаў, пазначаўшых граніцу ў 1473 г., альбо з прадстаўленнем лівонскімі камісарамі адрознай інфармацыі. Не заўсёда існавала ўзгодненасць і па інтэрпрэтацыі таго ці іншага знака. Так, напрыклад, у 1542 г. ужо ў пачатку працэдуры дэмаркацыі ўзнікла дыскусія аб пачатковым пункце руху адной з груп камісараў: “А коли было назавтрє й ɣ нє дє лю, то є стъ по Свє томъ Анътонию, мы, которыє были є смо посланы кɣ границамъ московъскимъ, зъє халисѧ є смо вє сполокъ з обɣ сторонъ на тоє ж мє стцо на копє ц, ɣ которомъ сосъна и липа, и с тыми з ими с коренѧ выкопаны сɣ ть, и хотє ли є смо постɣ повати и є хати водлє ɣ мовы и ωписаньѧ пановъ посланъцовъ мистра Лиѳ ълѧнтъского, лє чъ ωны намъ чог(о) допɣ стити не хотє ли, повє даючы причыны неслɣ шъныє – ѧкобы то нє былъ копє ц Радивиловъ, алє пє чъ, ɣ которой попє лъ жгли” [1, с. 62]. У сувязі з гэтым узрастала важнасць паказанняў сведкаў – мясцовых жыхароў, якія мелі інфармацыю пра пазнакі мяжы. У якасці сведкаў прыцягвалі “свє тъковъ добрых, людє й старых, вє ры годных” [1, с. 68, 75]. Часам гэта былі людзі вельмі сталага веку, “которых на возех вывозили до насъ, которие нє могли ходить…” [1, с. 68]. Цікава, што некаторыя са сведкаў яшчэ ў дзіцячым узросце ўдзельнічалі ў размежаванні Радзівіла, аб чым паведамілі новым камісарам у 1542 г.: “Мы памє тає мъ, коли панъ Радивилъ є здилъ и граничилъ з немъцы за Его м(и)л(о)сти Королѧ Казимира. В тотъ часъ ωтъцове наши є здили с паномъ Радивиломъ, и насъ в тотъ часъ, дє тє й своих, зъ собою брали. И тотъ є здъ памє тає мъ, и границɣ пана Радивиловɣ …” [1, с. 76]. Такім чынам, можна меркаваць, што сведкаў па памежных справах рыхтавалі загадзя і ўдзел у

Бібліятэка БГУІР

справе дэмаркацыі дзяцей меў на ўвазе іх далейшае прыцягненне да падобных працэдур у дарослым і яшчэ больш сталым узросце.

Прыкладна палову аб’ёму зместу Кнігі № 560 займаюць запісы скаргаў памежных жыхароў ВКЛ. Камісары ВКЛ старанна апытвалі сведкаў і збіралі іх скаргі на памежнае насельніцтва і адміністрацыю Лівоніі. Змест скаргаў уніфікаваны ў адпаведнасці з пратаколам і ўтрымлівае інфармацыю пра злачынствы лівонскіх прадстаўнікоў і пералік паграбленай маёмасці. Акрамя шматлікіх пакраж грошай, маёмасці і свойскай жывёлы (коней, кароў, авечак, свіней і г.д.) і птушкі, падпалаў сядзіб скаргі фіксуюць і больш цяжкія злачынствы лівонскіх падданых, у першую чаргу забойствы памежных літвінскіх жыхароў, а таксама захопы літвінскіх палонных і вывад іх на тэрыторыю Лівоніі. Падрабязна пазначаліся захопы лівонскім бокам зямельных абшараў і азёр ВКЛ. Тэрмін даўнасці некаторых з такіх прыўлашчванняў сягаў да 30 гадоў перад правядзеннем дэмаркацыі 1542 г. [1, с. 64]. Працягваліся яны і падчас дзейнасці камісіі 1542 г. Напрыклад, асвейскія сведкі паведамілі літвінскім камісарам, што “такъ вжо вамъ, бү дү чы ү  Кү рчмохъ, и нє мъцы, зає хавъшы, сами собє  зє мли Ѡсвє йскоє  затє сали, почонъшы ѡтъ рє чъки Човъшы, гдє  ү падає ть ү  рє кү  Сарю, а Сарє ю рє кою ү низ” [1, с. 58, 82].

Калі параўноўваць змены на літвінска-лівонскай мяжы, што адбыліся ў перыяд з 1473 г. да 1542 г., можна адзначыць даволі значнае прасоўванне лівонцаў у паўднёвым напрамку. Характэрна, што захопленыя лівонцамі тэрыторыі ВКЛ не пакідаліся без клопату. У крыніцы паведамляецца пра асаджэнне на іх як падданых Лівоніі, так і выхадцаў з ВКЛ, частка з якіх, верагодна, былі ўцекачамі, арганізацыю гаспадарчай дзейнасці. Далучаныя землі актыўна асвойваліся, на іх ствараліся лівонскія службы з адпаведнай сістэмай павіннасцяў.

Такім чынам, матэрыялы Кнігі № 560 сведчаць пра наяўнасць дастаткова вялікай колькасці памежных кафліктаў паміж грамадзянамі ВКЛ і Лівоніі у канцы XV – першай палове XVI ст. і імкненне апошняй прасунуць свае межы далей на поўдзень за кошт тэрыторыі ВКЛ. Таму можна сцвярджаць, што адсутнасць адкрытых ваенных канфліктаў паміж ВКЛ і Лівонскай канфедэрацыяй і існаванне на пэўных этапах нават саюзніцкіх узаемаадносін паміж дзяржавамі зусім не гарантавала бяспечнага жыцця жыхарам памежжа.

Літаратура

1. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 560 (1541 – 1542 гг.). Кніга перапісаў № 3/ Падрыхтоўка тэксту да друку і навуковы апарат: Алег. І. Дзярновіч. 2-е выд. – Мінск: ATHENAEUM, 2010. – 268 с.: іл. 6. (Калекцыя “Помнікі, Том ІІ”)

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 560.

3. Российский государственный архив древних актов. Ф. 389. Оп. 1. Ч. 1. Д. 560.

Библиотека БГУИР